

**ШМАТКО Яніна Людвікаўна**
**(1947 г.)**

Нарадзілася ў вёсцы Падбалоцце Зэльвенскага раёна.

Базавую адукацыю атрымала ў роднай вёсцы (1953-1960 гг.), сярэднюю - ў Крамяніцы (1960-1964 гг.). У 1969 годзе паступіла ў Мінскі Дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Горкага на спецыяльнасць бібліятэказнаўства і бібліяграфія, які скончыла ў 1974 годзе.

Працавала метадыстам Зэльвенскай раённай бібліятэкі.

Сумесна з Уладзімірам Мазго - ініцыятар і арганізатар свята паэзіі і музыкі “Зэльвенскія Сакавіны”.

Цесна супрацоўнічае з газетай “Праца”.

Распрацавала і вядзе рубрыкі “Малюся слову”, “ Наш суразмоўца”, “Сустракаемся зноў”. З 2006 года ўзначальвае літаратурнае аб’яднанне “Зоры над Зальвянкай”. З 2016 года - клуб аматараў паэзіі “Малюся слову”.

Удзельнічае і дапамагае ў правядзенні пасяджэнняў клуба “Восень жыцця” і літаратурна-музычнай гасцёўні “Ліра”. Удзельніца пасяджэнняў клуба “Сярэбраная нітка”. Неаднаразовы ўдзельнік абласных і рэспубліканскіх конкурсаў. Выйшлі зборнікі “Вялікае сэрца маленькай жанчыны”, “Неаспрэчнае і спрэчнае ў біяграфіі Вікенція Равінскага”. У 2017 годзе пад адной вокладкай выходзяць справаздачы з паседжанняў клуба для пенсіянераў “Яны умеюць быць шчаслівымі”.

Выдадзены зборнікі ўсіх апублікаваных у газеце “Праца” нарысаў: “З удзячнасцю свайму роду”, “Ёсць што сказаць сваім людзям”, “Сагрэць душу другому”.

**Бібліяграфія**


1. **Майстар слова са сваім почыркам** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://zelwa.by/majstar-slova-sa-svaim-pochyrkam/. - Дата обращения: 30.11.2022.
2. **Шматко, Я. Вялікае сэрца маленькай жанчыны: (артыкул аб маці)** / Яніна Шматко. — Зэльва: Зэльвенская цэнтральная раенная бібліятэка, 2006. — 6 с.